


*Рэктарат, грамадскія арганізацыі універсітэта горача і сардэчна віншуюць выкладчыц, супрацоўніц і студэнтак з Днём жанчын, жадаюць ім моцнага здароўя, асабістага шчасця, плённай працы і паспяховай вучобы!*

* * *

*Першае вясновае свята, нягледзячы на складанасці сённяшняга жыцця, усё ж прыносіць у душы жанчын радасць і хваляванне.*

## 8 САКАВІКА -- ДЗЕНЬ ЖАНЧЫН

*Адступаюць на задні план паўсядзённыя турботы, калі ў іх адрас гучаць у дзень 8 Сакавіка толькі цёплыя, прыемныя словы ад калег, мужоў, сыноў. Сціплы ці больш дарагі падарунак, букет кветак, якія яны атрымліваюць разам з сардэчнымі віншаваннямі, саграваюць іх сэрцы. І навакольны свет здаецца не такім ужо і змрочным, калі жанчыны адчуваюць, што іх паважаюць, кахаюць...*

*Сёння цудоўную палову універсітэцкага калектыву будуць ушаноўваць у рэктараце ГДУ.*

*Вялікай групе выкладчыц, супрацоўніц, студэнтак за поспехі ў працы, вучобе, актыўны ўдзел у грамацкім жыцці ўручаць граматы, грашовыя прэміі, аб'явяць падзяку.*

*Адбудзецца ў актавай зале і ўрачысты вечар ў гонар Дня жанчын.*

ГАЗЕТА ГОМЕЛЬСКАГА ДЗЯРЖАЎНАГА УНІВЕРСІТЭТА ІМЯ ФРАНЦЫСКА СКАРЫНЫ

# Гомельскі універсітэт



№ 4 (961) | ПЯТНІЦА, 5 сакавіка 1999 г. | Газета заснавана ў верасні 1969 года | Выходзіць два разы ў месяц | Цана дагаворная

*4 красавіка -- дзень выбараў у мясцовыя Саветы дэпутатаў*

## ІМ АКАЗАНЫ ДАВЕР

Імя рэктара нашага універсітэта, выдатнага вучонага – матэматыка, члена-карэспандэнта НАН Беларусі Л.А.ШАМЯТКОВА добра вядома навукоўцам не толькі Беларусі, але і далёка за яе межамі. Таму невыпадкова яго кандыдатуру вылучыў ў дэпутаты Гомельскага абласнога Савета працоўны калектыў палiклiнiкi №1 па Юбілейнай выбарчай акрузе №3.

У галасаванні прымуць удзел многія выкладчыкі, супрацоўнікі і студэнты нашага універсітэта. Перакананы, што яны зробяць правільны выбар.

Разам з тым нагадаем: у 18 акругах Гомеля ў абласны Савет дэпутатаў зарэгістравана 72 кандыдаты – па чатыры на адно месца. Так што барацьба прадстаіць прынцыповая і сур'ёзная.

***

На сходзе працоўнага калектыву фізічнага факультэта адбылося вылучэнне кандыдата ў дэпутаты Гомельскага гарадскога Савета па Палескай выбарчай акрузе № 6. Давер аказаны прарэктару па культурна-асветніцкай рабоце нашага універсітэта ЛЫСЯНКОВУ Аляксандру Вiтальевiчу.

## ПРЭМІЯ ПРЭЗІДЭНТА – РЭКТАРУ ГДУ

Прэзідэнтам Рэспублікі Беларусь А.Лукашэнкам устаноўлена прэмія за асабісты ўклад у развіццё здольнасцей адоранай моладзі. Першым яе ўладальнікам у адпаведнасці з распараджэннем кіраўніка дзяржавы стаў рэктар нашага універсітэта член-карэспандэнт НАН Беларусі, акадэмік Беларускай акадэміі адукацыі, прафесар Л.А.Шамяткоў.

Прэмія ў памеры 5250000 руб. выплачваецца са сродкаў спецыяльнага фонду Прэзідэнта Беларусі.

Хроніка

## НОВЫ ДЭКАН БІЯФАКА

Загадам рэктара ад пасады намесніка дэкана біялагічнага факультэта вызвалены дацэнт кафедры заалогіі і аховы прыроды Талкачоў Васіль Іванавіч, які назначаны дэканам біяфака.

Абавязкі намесніка дэкана ўскладзены на дацэнта кафедры хіміі Свірыдзенка Валянціну Рыгораўну.



## ХТО СТАНЕ ЛЕПШЫМ НА ГЭТЫ РАЗ?

У апошнія гады стала традыцыяй праводзіць конкурсы "Містэр універсітэта". Сёлета ён адбудзецца ў актавай зале 12-га сакавіка. Гэта захапляючае відовішча назіраюць шматлікія гледачы. Так будзе і на гэты раз. Ну аб пераможцах мы паведамім у наступным нумары газеты.



**Вясна – не толькі на лістках календара. Яна і ў душы Наталлі Калінічэнкі – студэнткі-трэцякурсніцы спецыяльнасці руская і беларуская мова і літаратура. Будучаму філолагу, выдатніцы вучобы, вялікаму аматару паэзіі назначана з бягучага навучальнага семестра стыпендыя імя А.С.Пушкіна, 200-годдзе з дня нараджэння якога адзначаем мы сёлета.**

**На здымку: Наталля Калінічэнка.**

**Фота І.ЧЫСЦІКА.**

## З НЕВЫЧАРПАЛЬНЫМ НАТХНЕННЕМ

Сёння – у перадсвяточны Дзень жанчын – самыя цёплыя словы мне хочацца сказаць пра старшага выкладчыка нашай кафедры, намесніка дэкана па выхаваўчай рабоце Тамару Пятроўну Жалонкіну. Усё яе жыццё звязана са стаўшай роднай вядучай на Беларускім Палессі вышэйшай навучальнай установай. Яна атрымала дыплом фізіка пасля заканчэння Гомельскага педагагічнага інстытута імя В.П.Чкалава і ўсю педагагічную, навуковую і выхаваўчую дзейнасць звязала з фізічным факультэтам, стала адным з самых кваліфікаваных і вопытных яго выкладчыкаў.

Студэнты не толькі нашага, але і іншых факультэтаў значную частку сваіх ведаў і навыкаў набываюць у вучэбнай лабараторыі малекулярнай фізікі і цеплыні пад кіраўніцтвам Тамары Пятроўны. Тут заўсёды чыста і ўтульна, усе прыборы знаходзяцца ў спраўным стане. Так можа быць толькі ва ўмелай і клапатлівай гаспадыні. Да таго ж яна яшчэ вядзе практычныя заняткі па электрычнасці і магнетызму для будучых фізікаў, чытае лекцыі на матэматычным і іншых факультэтах. І яны вельмі запамінальныя для студэнтаў, бо праходзяць на высокім узроўні з улікам сучасных патрабаванняў.

Тамара Пятроўна – прыклад для ўсіх выкладчыкаў і ў той справе, як трэба кіраваць навуковымі даследаваннямі студэнтаў. На фізічным факультэце ў яе самая вялікая колькасць сумесных публікацый са сваімі выхаванцамі. Многія студэнты напісалі сваю першую навуковую працу, зрабілі першы навуковы даклад на канферэнцыі дзякуючы Тамары Пятроўне. Цяпер яна плённа працуе над стварэннем на нашай кафедры студэнцкай навукова-даследчай лабараторыі.



Вельмі многае робіць Тамара Пятроўна па выхаванню студэнцкай моладзі. Работа куратараў, сустрэчы з цікавымі людзьмі, наведванне студэнтамі канцэртаў, спектакляў, разнастайных выстаў – ва ўсім гэтым праяўляюцца яе нераўнадушныя адносіны да вельмі адказных абавязкаў.

Кажуць, што ўзрост чалавека вызначаецца не гадамі, а станам душы. Працуючы побач з Тамарай Пятроўнай, разумееш, што гэта сапраўды так.

**І.СЕМЧАНКА,**
**загадчык кафедры агульнай фізікі, доктар фізіка-матэматычных навук, прафесар.**

## МАТЭРЫЯЛЬНЫ ПЛЮС ДА СТЫПЕНДЫІ

Напярэдадні свята – Дня жанчын стыпендыятамі прафкома студэнтаў сталі чацвёртакурсніца філалагічнага факультэта Наталля Валошына і Юлія Ларчанка з факультэта фізічнай культуры (IV курс). Гэтага дзяўчаты ўдастоены за актыўную прафсаюзную работу на факультэтах і ва універсітэце.

Рашэнне заахвоціць названых студэнтак дадатковай стыпендыяй у памеры адной мінімальнай зарплаты аднагалосна было прынята на апошнім пасяджэнні прафкома студэнтаў ГДУ.

## ПРАФСАЮЗ -- ЮБІЛЯР

Споўнілася 75 гадоў прафсаюзным арганізацыям вучнёўскай моладзі. Гэтай знамянальнай даце прысвячаўся Рэспубліканскі форум, які быў праведзены БРК прафсаюза работнікаў адукацыі і навукі ў г.Мінску ў другой дэкадзе лютага. У яго праграме былі навукова-практычная канферэнцыя "Прафсаюзы і вучнёўская моладзь: гісторыя, праблемы, перспектывы" і святочны вечар.

На канферэнцыі былі заслуханы шматлікія даклады яе ўдзельнікаў, у якіх уздымаліся разнастайныя пытанні і праблемы прафсаюзных арганізацый на сучасным этапе. Абмяркоўваліся пытанні ўзаемадзеяння адміністрацый навучальных устаноў і прафкомаў студэнтаў у забеспячэнні абароны правоў і законных інтарэсаў моладзі, малазабяспечаных студэнтаў, студэнтаў-сірот, праблемы аздараўлення студэнцкай моладзі, некаторыя падыходы да фарміравання асобаснай канцэпцыі маладога чалавека і інш.

У рабоце канферэнцыі прымала ўдзел і выступіла з дакладам "Арганізацыя вольнага часу студэнтаў" старшыня прафкома студэнтаў ГДУ Н.І.Колтышава.

На ўрачыстым вечары ў гонар юбілею студэнту III курса юрыдычнага факультэта нашага універсітэта Андрэю Кражаву былі ўручаны пасведчанне аб назначэнні яму стыпендыі Беларускага рэспубліканскага камітэта прафсаюза работнікаў адукацыі і навукі з II семестра бягучага навучальнага года і сама стыпендыя ў памеры 2-х мінімальных зарплат.

За дасягнутыя поспехі ў навучанні і выхаванні моладзі, шматгадовую актыўную работу па абароне законных правоў і інтарэсаў студэнтаў і ў сувязі з 75-годдзем стварэння прафсаюзных арганізацый вучнёўскай моладзі групе ўдзельнікаў урачыстасцей былі ўручаны граматы Міністэрства адукацыі Рэспублікі Беларусь. Яе ўдастоена таксама старшыня прафкома студэнтаў ГДУ Н.І.Колтышава.

## З УЗНАГАРОДАЙ!

*За шматгадовую плённую вучэбную работу па падрыхтоўцы маладых спецыялістаў і актыўны ўдзел у грамадскім жыцці Ганаровай граматай універсітэта ўзнагароджаны старшы выкладчык кафедры фізічнага выхавання і спорту, намеснік дэкана біялагічнага факультэта па фізвыхаванню АСТАХАЎ Уладзімір Пятровіч.*

# АБ ВЫНІКАХ АТЭСТАЦЫІ

З 30 лістапада па 30 снежня 1998 г. была праведзена атэстацыя Гомельскага дзяржаўнага універсітэта імя Францыска Скарыны.

На падставе прадстаўленых атэстацыйнай камісіяй матэрыялаў Дзяржінспекцыя навучальных устаноў Міністэрства адукацыі Рэспублікі Беларусь пастанаўляе:

1. Зацвердзіць Заключэнне атэстацыйнай камісіі "Аб выніках атэстацыі Гомельскага дзяржаўнага універсітэта імя Ф.Скарыны".

2. Гомельскі дзяржаўны універсітэт імя Ф.Скарыны лічыць атэставаным на статус


МІНІСТЭРСТВА АДУКАЦЫІ РЭСПУБЛІКІ БЕЛАРУСЬ
ДЗЯРЖАЎНАЯ ІНСПЕКЦЫЯ НАВУЧАЛЬНЫХ УСТАНОЎ
ПАСВЕДЧАННЕ

вышэйшай навучальнай установы універсітэцкага тыпу.

3. Лічыць Гомельскі дзяржаўны універсітэт імя Ф.Скарыны атэставанай вышэйшай навучальнай установай па спецыяльнасцях і спецыялізацыях (змешчаны ніжэй).

4. У адпаведнасці з п.2.9. "Тыпавога палажэння аб атэстацыі і акрэдытацыі навучальных устаноў Рэспублікі Беларусь" выдаць Гомельскаму дзяржаўнаму універсітэту імя Ф.Скарыны тэрмінам на 5 гадоў Пасведчанне аб дзяржаўнай атэстацыі па пералічаных ніжэй спецыяльнасцях і спецыялізацыях.

5. Рэктару Гомельскага дзяржаўнага універсітэта імя Ф.Скарыны (Шамяткову Л.А.) распрацаваць да 1 красавіка 1999 г. і прадставіць у Дзяржаўную інспекцыю навучальных устаноў план мерапрыемстваў па ліквідацыі выяўленых недахопаў. Да 1 снежня 1999 г. прадставіць матэрыялы аб іх выкананні.

6. Кантроль за выкананнем дадзенай Пастановы ўскласці на аддзел інспектавання вышэйшых навучальных устаноў Дзяржінспекцыі.

Пералік спецыяльнасцей і спецыялізацый, па якіх атэставаны Гомельскі дзяржаўны універсітэт імя Ф.Скарыны

**Г.05.01.00 Гісторыя**
Г.05.01.02 Гісторыя Беларусі XIX-XX стагоддзяў
Г.05.01.04 Новая і навейшая гісторыя замежных краін
Г.05.01.05 Гісторыя славянскіх краін
**П.02.01.00 Гісторыя**
П.02.01.03 Замежная мова
**Г.09.01.00 Правазнаўства**
Г.09.01.01 Дзяржаўнаправавая
Г.09.01.02 Гаспадарчаправавая
Г.09.01.03 Судоваракурорска-следчая
**Г.02.02.00 Руская мова і літаратура**
Г.02.02.01 Мовазнаўства
Г.02.02.02 Літаратуразнаўства
Г.02.02.05 Руская мова і літаратура, беларуская мова і літаратура
**Г.02.01.00 Беларуская мова і літаратура**
Г.02.01.01 Мовазнаўства
Г.02.01.02 Літаратуразнаўства
Г.02.01.10 Беларуская мова і літаратура, замежная мова
**П.02.07.00 Англійская мова**
П.02.07.01 Нямецкая мова
П.02.07.02 Французская мова
**П.02.08.00 Нямецкая мова**
П.02.08.01 Англійская мова
**Н.01.01.00 Матэматыка**
Н.01.01.01 Алгебра і тэорыя лікаў
Н.01.01.04 Дыферэнцыяльныя ўраўненні
Н.01.01.06 Тэорыя імавернасцей і матэматычная статыстыка
Н.01.01.17 Матэматычная інфарматыка
**Н.08.01.00 Прыкладная матэматыка**
Н.08.01.04 Лікавыя метады
Н.08.01.09 Матэматычнае і праграмнае забеспячэнне вылічальных машын і сістэм
**Э.01.03.00 Эканоміка і кіраванне вытворчасцю (з 1997 г. Э.01.03.00 Эканоміка і кіраванне на прадпрыемстве)**
Э.01.03.04 Эканоміка і кіраванне ў знешнеэканамічнай дзейнасці
Э.01.03.05 Прававы механізм гаспадарчай дзейнасці
**Э.01.07.00 Бухгалтарскі ўлік, аналіз і аўдыт**
Э.01.07.07 Улік, аналіз і аўдыт у банках
Э.01.07.09 Улік, аналіз і аўдыт у знешнеэканамічнай дзейнасці
**Н.02.01.00 Фізіка**
Н.02.01.05 Лазерная фізіка і спектраскапія
Н.02.01.14 Мікраэлектроніка
Н.02.01.15 Фізічная метралогія і аўтаматызацыя эксперыменту
Н.02.01.16 Камп'ютэрнае мадэліраванне фізічных працэсаў
**Т.10.01.00 Аўтаматызаваныя сістэмы апрацоўкі інфармацыі**
Т.10.01.02 Аўтаматызаваныя сістэмы кіравання ў радыёэлектроннай прамысловасці
**Н.05.01.00 Геаграфія**
Н.05.01.12 Рацыянальнае прыродакарыстанне і ахова прыроды
**П.01.05.00 Геаграфія**
П.01.05.04 Замежная мова
**Т.20.01.00 Геалогія і разведка карысных выкапняў**
Т.20.01.02 Геафізічныя метады пошукаў і разведкі
**Н.04.01.00 Біялогія**
Н.04.01.01 Заалогія
Н.04.01.02 Батаніка
Н.04.01.04 Фізіялогія чалавека і жывёлін
Н.04.01.05 Біяхімія



УРУЧЭННЕ ПАСВЕДЧАННЯ АБ АТЭСТАЦЫІ УНІВЕРСІТЭТА

**Э.ШЕВЦОВ**

**Коллективу Гомельского государственного университета им.Ф.Скорины по случаю аттестации**

*Вы из тех,*
*кто милости не просит*
*у светил, у Господа, судьбы.*
*Кто-то смалодушничал*
*и бросил*
*Вас в разгар чернобыльской беды.*

*Но трудились с мужеством и рвеньем*
*Вы, достигнув творческих высот!*
*Новое окрепло поколенье,*
*с кем ваш вуз*
*в грядущее придет.*

*Пусть признанье станет Возрожденьем!*
*Верим мы безмерно, что придет*
*к вам успех в трудах*
*и вдохновенье,*
*и дерзаний смелых гордый взлёт.*

*В этот день мы счастья вам желаем.*
*Чтоб с прямой дороги не свернуть,*
*Солнца вам и радости без края!*
*Дел не счесть, друзья,*
*в счастливый путь!*

# НА САВЕЦЕ УНІВЕРСІТЭТА

25-га лютага адбылося чарговае ў бягучым навучальным годзе пасяджэнне Савета універсітэта. Першым на парадку дня было пытанне аб арганізацыі навучальнага працэсу па новых спецыяльнасцях — экалогіі, псіхалогіі, фізічнай электроніцы. Заслуханы і абмеркаваны паведамленні загадчыкаў адпаведных кафедр дацэнтаў А.М.Кусянкова, А.А.Лытко, С.В.Шалупаева, пасля чаго было прынята адпаведнае рашэнне.

Па інфармацыях начальніка НДС В.Р.Сафонава абмеркаваны і зацверджаны план навукова-даследчых работ універсітэта на 1999 год, даведзены да ведама вынікі дадатковага конкурсу на атрыманне грантаў дактарантамі, аспірантамі і студэнтамі і супрацоўніцтва з адміністрацыяй свабоднай эканамічнай зоны "Гомель-Фатон". Была прынята яго ж прапанова аб адкрыцці часовага навуковага калектыву.

Па інфармацыях загадчыцы аспірантурай С.Ф.Зобавай зацверджаны тэмы доктарскай дысертацыі загадчыка кафедры АЛФК Г.І.Нарскіна і кандыдацкіх дысертацый.

Прыняты рашэнні аб перайменаванні факультэта давузаўскай падрыхтоўкі і прафарыентацыі ў факультэт псіхалогіі і давузаўскай падрыхтоўкі. Цяпер на ім будуць працаваць дзве кафедры: псіхалогіі і давузаўскай падрыхтоўкі; давузаўскай падрыхтоўкі і прафарыентацыі.

Кафедра правазнаўства рэарганізавана ў дзве: грамадзянска-прававых дысцыплін і крымінальнага права і працэсу.

Старшыня прафкома студэнтаў Н.І.Колтышава праінфармавала Савет аб медыцынскім абслугоўванні студэнтаў, а вучоны сакратар В.Ю.Залатарэнка — аб ходзе выканання рашэнняў Савета.

На вакантныя пасады абраны: загадчыкам кафедры беларускай літаратуры — доктар філалагічных навук, прафесар І.Ф.Штэйнер, загадчыкам кафедры геалогіі і разведкі карысных выкапаў — кандыдат геолага-мінералагічных навук, дацэнт А.Ю.Трацэўская, якая раней працавала ў Беларускім інстытуце інжынераў чыгуначнага транспарту.

Савет прыняў рашэнне аб хадайніцтве перад БелВАКам аб прысуджэнні вучонага звання дацэнт дэкану юрыдычнага факультэта Ю.А.Ключнікаву, намесніку дэкана філалагічнага факультэта У.А.Бобрыку, кандыдату эканамічных навук з кафедры бухуліку, кантролю і АГД Л.М.Кравец.

*Са сходу працоўнага калектыву*

# ЯК ВЫКОНВАЕЦЦА КАЛЕКТЫЎНЫ ДАГАВОР?

Аб гэтым вялася размова на сходзе працоўнага калектыву універсітэта, які адбыўся 25 лютага.

З інфармацыяй выступіў рэктар ГДУ член-карэспандэнт НАН Беларусі, акадэмік Беларускай акадэміі адукацыі, прафесар Л.А.Шамяткоў. Адзначалася, што ўмовы заключанага ў мінулым годзе дагавора, які з'яўляецца нарматыўным актам і рэгулюе працоўныя і сацыяльна-эканамічныя адносіны паміж адміністрацыяй і работнікамі універсітэцкага калектыву, у асноўным выконваюцца.

Так, у прыватнасці, што тычыцца арганізацыі і аплаты працы, устаноўлены даплаты работнікам, якія звязаны з неспрыяльнымі ўмовамі працы, за работу ў начны час, ненарміраваны рабочы час, сумяшчэнне прафесій (пасад) і г.д.

У адпаведнасці з Палажэннем аб матэрыяльным стымуляванні працы работнікаў універсітэта устанаўліваюцца надбаўкі кіраўнікам, спецыялістам і служачым за высокія творчыя, вытворчыя дасягненні ў памеры да 50% пасадавых акладаў. На гэтыя мэты накіроўваецца 10% планавага фонду зарплаты штатных работнікаў.

Надбаўкі па бюджэту ўстаноўлены 346 супрацоўнікам, у тым ліку: 159 выкладчыкам, 187 супрацоўнікам. Дэканам, начальнікам аддзелаў, спецыялістам вядучых аддзелаў, распрацоўшчыкам АСК — 50%, нам. дэканаў па вучэбнай рабоце, кіраўнікам і спецыялістам іншых аддзелаў — 45%, нам. дэканаў па выхаваўчай рабоце, заг.інтэрнатамі — 40%, загадчыкам кафедр, камендантам вучэбных карпусоў і асобным спецыялістам — 30%, асобным выкладчыкам і супрацоўнікам ад 5 да 30%.

У адпаведнасці з дадаткам №1 да Калектыўнага дагавора праводзіцца штомесячнае прэміраванне работнікаў ГДУ. На гэтыя мэты накіроўваецца 10% планавага фонду зарплаты штатных работнікаў універсітэта і эканомія заработнай платы (па вакантных пасадах і бальнічных лістах). Эканомія падлічваецца штомесячна і своечасова выплачваецца ў выглядзе прэміі. За перыяд з дня прыняцця Калектыўнага дагавора выплачана прэмія на агульную суму 5150,4 млн.руб., у тым ліку па бюджэту на суму 4193,6 млн.руб. (па плану — 3538,1 млн.руб., за кошт эканоміі — 655,5 млн.руб.).

Згодна дадатка №2 да Калектыўнага дагавора аказвалася матэрыяльная дапамога супрацоўнікам па іх заявах. Акрамя таго, у межах выдзеленых сродкаў з рэспубліканскага бюджэту (10% фонду зарплаты штатных супрацоўнікаў) адзін раз у два месяцы аказвалася матэрыяльная дапамога ўсім супрацоўнікам ГДУ ў сувязі з ростам цэн і інфляцыяй, таму што заработная плата работнікаў адукацыі значна адстае ад сярэдняй зарплаты вытворчай сферы.

За справаздачны перыяд на аказанне матэрыяльнай дапамогі зрасходавана 2102,6 млн.руб, у тым ліку па бюджэту — 1765,3 млн.руб. Акрамя таго, па

(Заканчэнне на 3-стар.)

# ЗНАНИЯ ЗАКРЕПЛЯЕТ ПРАКТИКА

Идет второй семестр учебного года. Его финиш будет бурным в весенне-летние дни. Предстоят курсовые работы по ряду дисциплин. Увеличится число экзаменов. Затем последует пора практик.

Студентов II курса геолого-географического факультета специальности "Геология и разведка полезных ископаемых" в соответствии с программой ждут полевые практики по геологической съемке и геофизическим методам исследований. При их прохождении закрепляются теоретические знания по таким дисциплинам как "Структурная геология и геологическое картирование", "Геотектоника", "Историческая геология с основами палеонтологии" и др. Главная цель практик в том, чтобы студенты приобрели навыки проведения геолого-съемочных работ. Без этого немыслим геолог как специалист. Поэтому геологическое картирование является обязательным этапом геолого-поисковых работ, одним из наиболее эффективных средств изучения строения верхних частей земной коры и важнейшим способом поисков полезных ископаемых. Именно на этой практике закладываются основы, необходимые для дальнейшего теоретического и практического обучения будущих специалистов.

Главным условием для проведения практики по геологической съемке является наличие выходов древних горных пород в их коренном залегании на дневную поверхность. Геологи называют их обнажениями. При изучении геологических строений в обнажениях производится послойное описание горных пород, делаются необходимые замеры, зарисовки и фотоснимки, выделяются геологические тела, отличающиеся по возрасту или по их генетической принадлежности. Прослеживая во время маршрутов границы геологических тел от обнажения к обнажению и нанося их на топооснову, практиканты составляют геологическую карту района.

Территория Беларуси характеризуется развитием мощного чехла четвертичных отложений, плащеобразно перекрывающих более древние породы. Выходы древних пород на дневную поверхность немногочисленны, как правило, по наиболее крупным рекам — Днепру, Западной Двине, Сожу, Ипути, Уборти и др. Поэтому и выезжали в прежние годы студенты-геологи сначала на Кавказ, а затем в Крым.

С развалом СССР проведение геологической практики за пределами Беларуси оказалось трудноосуществимым. Прежде всего, из-за невозможности финансирования в иностранной валюте.

В связи с тем, что среди других ледниковых районов Восточно-Европейской равнины Беларусь отличается значительной мощностью четвертичных (антропогеновых) отложений, превышающей 300 метров, и большой полнотой геологического разреза, необходимо было выбрать район с наиболее полными разрезами и наилучшей их сохранностью. Таким является Шкловско-Оршанский район, где ледниковые комплексы выполняют глубокие Александрийскую и Копысскую ложбины. К тому же, в овраге Нижнинский Ров расположенном на левом берегу Днепра у г.Шклова, обнажены комплексы, соответствующие днепровскому и сожскому оледенениям, и межледниковые образования.

Первый же наш выход со студентами в ознакомительный маршрут в Нижнинский Ров подтвердил, что мы не ошиблись в выборе. Здесь мы наблюдали все многообразие образований, связанных с деятельностью ледников, — моренные песчано-гравийные с валунами неслоистые толщи, водно-ледниковые пески с различной сортировкой материала и слоистостью, озерные глины, переходящие в торфяники, и т.д. Породы эти различной генетической принадлежности находятся в разрезе в сложных взаимоотношениях.

После ознакомления с разрезами в оврагах и в промышленных карьерах, обучения приемам ориентировки и привязки на местности, выполнения замеров, записей и зарисовок, фотосъемок студенты самостоятельно выполняли геолого-съемочные работы на отведенных бригадам полигонах. Немало пришлось перелопатить земли, прослеживая геологические границы при помощи закопушек и расчисток. В отведенное камеральное время данные наблюдений обрабатывались, увязывались с результатами предыдущих работ, систематизировались, производились построения. Программа практики была выполнена в установленные сроки. В заключительный камеральный период практиканты завершали составление геологических профилей и карт, оформление их и написание отчетов. Завершением практики была защита отчетов каждой бригадой. Цели, которые преследует эта учебная практика, были достигнуты. Главное, студенты получили навыки геологического картирования.

После завершения практики по геологической съемке будущие геологи сразу приступили к практике по геофизическим методам исследований, продолжив съемку по тем же маршрутам с помощью методов высокоточной гравиметрии, магнитометрии и электроразведки, которые помогают уточнять геологическое строение, особенно на недоступных натурным наблюдениям участках.

Обнажение Нижнинский Ров и его окрестности объявлены геологическим памятником природы республиканского значения. Нашим студентам выпала почетная миссия по установке памятного знака.

Отчеты о проведенных полевых практиках заслушаны на заседании кафедры геологии и разведки полезных ископаемых. Мнения участников обсуждения единодушны — район выбран удачно. Однако для проведения их в этом году еще на более высоком уровне потребуется более тщательная подготовка.

Во-первых, требуется произвести сбор всей геологической информации по Шкловско-Оршанскому району, необходимую как для использования во время практик, так и для составления методического руководства по проведению практики по геологической съемке ледниковых четвертичных (антропогеновых) комплексов.

Во-вторых, необходимо обеспечение топоосновой района в масштабе 1:10000 (1:25000) и аэрофотоснимками, что позволило бы провести съемку на большей площади с перекрытием полигонов на их границах. На наш взгляд, усвоение навыков картирования было бы более эффективным, если совместить практики по геологической съемке и геофизическим методам, комплексируя маршрутные исследования. Это, конечно, требует дополнительного финансирования для оплаты преподавателям, но важнее практический результат.

В программе практики необходимо предусмотреть обзорный маршрут автобусом до поселка Руба Витебской области с целью наблюдения разреза дочетвертичного ложа и характера его контактов с четвертичными отложениями.

**А.ИЛЬИНЧИК, ст. преподаватель; К.ПАСКАРУ, ассистент кафедры геологии и разведки полезных ископаемых.**

*Са сходу працоўнага калектыву*

## ЯК ВЫКОНВАЕЦЦА КАЛЕКТЫЎНЫ ДАГАВОР?

**(Заканчэнне. Пачатак на 2-стар.).**

распараджэнню Прэзідэнта рэспублікі на аказанне матэрыяльнай дапамогі была дадаткова накіравана эканомія зарплаты за 4 квартал 1998г. у суме 458,9 млн.руб.

Горш абстаяць справы з выкананнем тых мерапрыемстваў, якія звязаны з рамонтам універсітэцкіх карпусоў, падтрымліваннем іх у належным стане. Грошай, якія выдзяляюцца на гэта, не хапае. Нейкім чынам паправіць становішча можна будзе з дапамогай сродкаў, выдзеленых універсітэту аблвыканкомам на рамонтна-будаўнічыя работы. Іх сума складае 13,6 млрд.руб.

На сходзе выступіў старшыня прафкома універсітэта Г.І.Варатніцкі, які сканцэнтраваў увагу на тых палажэннях Калектыўнага дагавора, за выкананне якіх нясуць адказнасць работнікі АГЧ ГДУ. Адзначалася, што некаторыя пытанні не вырашаюцца з-за іх не зусім адказных адносін да даручанай справы. Так, напрыклад, не вядзецца рамонт дахаў вучэбных карпусоў, даўно знаходзяцца ў аварыйным стане корпус №1, патрабуе замены ўся электраправодка ў інтэрнаце №1 на вул.Савецкай, 83,а. Неабходна таксама зрабіць агароджу вакол санаторыя-прафілакторыя, каб акаляючая яго тэрыторыя не працягвала служыць месцам для выгулу сабак, распіцця спіртнога розных прахожых і г.д. Не першы год не ідзе далей размоў справа з устаноўкай у інтэрнаце на Валатаве вяртушкі на прахадной.

Старшыня прафкома студэнтаў Н.І.Колтышава і галоўны ўрач санаторыя-прафілакторыя С.А.Залатых гаварылі на сходзе аб мерах, якія прымаюцца для аздараўлення і лячэння студэнтаў універсітэта. Многае робіць у гэтым плане паліклініка №6, якая абслугоўвае студэнтаў, і універсітэцкая здраўніца. У сувязі з тым, што колькасць хворых студэнтаў павялічваецца з-за вынікаў чарнобыльскай аварыі, стаіць неабходнасць распрацоўкі ва універсітэце комплекснай праграмы "Здароўе".

Удзельнікамі сходу працоўнага калектыву прынята рашэнне засяродзіць увагу на тых пунктах Калектыўнага дагавора, якія пакуль рэалізоўваюцца слаба.

*Слово — иностранным студентам*

## МОЯ РОДИНА -- ПРОВИНЦИЯ ЦЗЯНСУ

Уже 6-й год на экономическом факультете учится группа китайских студентов, которые приехали в Гомель из восточной провинции Цзянсу. Гомель стал для нас второй родиной. Мы любим его, но, конечно же, скучаем по родине.

Мне бы хотелось познакомить своих друзей с нашей провинцией. Население — примерно в 7 раз больше, чем в Беларуси, а ее площадь составляет только половину вашей республики. Равнины занимают 68% территории провинции, 14% — холмистая местность, 10% — реки и озера. Здесь влажный, теплый климат, с резко выраженными сезонными различиями. В провинции есть 13 городов, административный центр — город Нанкин. В истории страны этот город был столицей 6 раз, последний — с 1919 по 1949 гг. Поэтому в нем сохранились многочисленные памятники культуры.

За последние 20 лет в результате политических и экономических реформ в провинции Цзянсу произошли значительные перемены. В настоящее время она является одной из самых развитых в Китае. Текстильная промышленность играет важную роль в народном хозяйстве страны. Она включает отрасли по производству и крашению хлопчатобумажных, шелковых, шерстяных и льняных тканей, а также тканей из искусственных волокон, изготовлению трикотажа, готовой одежды и пр. Шелк, текстильные изделия и готовая одежда являются важной частью экспорта провинции. Только за 1996 г. экспорт готовой одежды дал провинции дохода на 8 млрд. долларов США. Но немаловажную роль играют в экономике провинции металлургическая, химическая и электронная промышленность.

Провинция пользуется, наряду с приморскими районами Китая, льготами во внешнеэкономической деятельности. Города Ляньюньган и Наньтун являются 2-мя из 14 открытых приморских городов. Они в ходе развития ориентируются на внешний экономический рынок и играют роль «окон» и посредников полной открытости Китая. Крупномасштабное привлечение иностранного капитала в провинции началось в 1979 г. Всего за 1979-1996 гг. было фактически освоено около 30 млрд. долларов США, из них 18 млрд. долларов составили внешние прямые инвестиции. Согласно статистическим данным за 1996 г. в провинции насчитывается более 35 тыс. предприятий с участием иностранного капитала.

Город Сюйчжон является одним из двух самых важных железнодорожных узлов. От порта Ляньюньгана по евразийской трансконтинентальной железнодорожной трассе можно проехать до нидерландского порта Роттердам. С 1992 года в городе Ляньюньгане началось технико-экономическое сотрудничество между Китаем и Россией по созданию АЭС.

Мы живем и учимся в Беларуси, белорусский народ относится к нам доброжелательно и проявляет большой интерес к Китаю. В 1997 г. между Гомелем и Хуэньином сложились братские отношения. После того, как делегация из Китая посетила Гомель, его мэр нанес ответный визит жителям нашего города.

К сожалению, наше обучение в Гомельском университете подходит к концу. Но по возвращению домой в Китай мы будем поддерживать отношения с нашими друзьями и способствовать укреплению экономических связей между Китаем и Беларусью.

**Ван ЛИЦЯНЬ, студент гр. ЭУ-53 экономического факультета.**

*Интервью*

# "ОБРЕСТИ ФОРМЫ — ЭТО ТРУД"

С известным врачом-психотерапевтом доктором Сайковым беседовала слушательница подготовительных курсов нашего университета Яна ПАРХОМЕНКО.

***О докторе Сайкове на телевидении и в прессе говорится очень много и часто. В то же время сам он редко дает интервью. Уже только от этого его личность вызывает повышенный интерес.***

**— Дмитрий Владимирович, что бы Вы ответили незнакомому человеку на вопрос, чем занимаетесь?**

— Я профессиональный психотерапевт. Не колдун и не знахарь. И занимаюсь именно профессиональной психотерапией.

**— И давно?**

— Кодированием — десять лет.

**— С какими проблемами к Вам чаще всего обращается молодежь: пристрастие к наркотикам, алкоголизм, табакокурение?**

— Что-то одно выделить трудно. Со всеми этими проблемами обращаются...

**— Я знаю, что Вы кодируете от псориаза, экземы, избыточного веса. Неужели между этими заболеваниями есть что-то общее?**

— Общее — это наша нервная система. Она вообще объединяет все. Ведь что такое нервная система? Это компьютер нашего организма, который управляет всеми его функциями. Например, кожные заболевания в 70 % случаев вызываются расстройствами нервной системы. Поэтому, воздействуя на пациентов через эту систему, можно добиться хорошего результата. Добиться же выздоровления традиционными методами, используя только мази и таблетки, очень сложно.

При избыточном весе, например, я, хотя и использую немного другой механизм, все равно, воздействую через нервную систему, стремлюсь повысить волевой потенциал человека. Ведь многие толстушки страдают еще и тем, что просто имеют определенную леность. А еще их пристрастие к еде может быть сравнимо с тягой алкоголика к спиртному. И опять же, воздействуя через нервную систему, можно влиять на сферу лечения: уменьшить аппетит, увеличить волевые качества. То есть, вернуть веру в себя.

**— Бывало ли, чтобы медицина оказалась бессильна помочь больному человеку, а Вы излечивали его?**

— "Медицина была бессильна" — это неточно сказано. Я сам — врач-психотерапевт. Но смысл вопроса понятен. Да, бывало так, что у людей непонятно почему давление "прыгает", болит сердце, усталость, врачи выписывают микстуры. Но помогают они недолго. Затем приходится повторять все снова, более того, оказывается, что эти болезни от лишних килограммов. И надо худеть. Но вы представьте, как 60-летней женщине похудеть. Вот она и обращается к нам, и мы вместе пытаемся избавиться от этого недуга. В итоге, похудев всего лишь на несколько килограммов, она чувствует себя бодрой, полной энергии, болезни проходят.

**— А в чем заключается механизм кодирования?**

— Во время сеанса производится воздействие на гипоталамус — участок мозга, отвечающий за обмен веществ в организме. Я даю толчок к нормализации обмена веществ, "сдвигается" баланс в сторону большего сжигания и меньшего отложения жиров.

**— И это эффективно?**

— Я считаю, что эффективно. Просто у каждого свой организм, кто-то поддается лечению сразу, кому-то нужен повторный сеанс.

**— А бывало, что кодирование не помогало?**

— Бывало и такое. А связано это с тем, что пациент сам не осознает ситуацию, в которую он попал, или просто не верит в возможность выздоровления. А ведь это очень важно, насколько он сам понимает свои проблемы, насколько верит в метод лечения. Кодироваться вроде и согласны, но не до конца понимают свои проблемы, больными себя не считают, а приходят из-за того, что настояли друзья или родственники.

**—Дмитрий Владимирович, хотелось бы остановиться на распространенной проблеме девушек — избыточном весе. Наверное, многие обращаются к Вам с этим?**

— Действительно, недовольные своей полнотой девушки приходят часто. Для них это не просто вопрос здоровья. Если люди старшего возраста худеют обычно для того, чтобы обрести здоровье, то для девушек это прежде всего красота и внешность. И поскольку актуальность этого для них высока, с нашей помощью они, как правило, достигают своей цели. Невозможное становится возможным.

**— Почему — "невозможное"?..**

— Случается, приходят девушки и говорят, что с детства были полными. То есть, тут присутствует масса всяких психологических комплексов, сформировавшихся на этой почве. С одной стороны, неверие в то, что это возможно, а с другой — явное желание похудеть. Мы и настраиваем пришедших на то, что это не чудо, а реальность. Правда, для этой реальности надо потрудиться: всех наших пациентов мы нацеливаем на серьезную работу.

**— А за процессом излечения следите?**

— Конечно. Вот вы видели, в холле сидят женщины. Это и те, кто уже достиг результатов, выполнил полную программу, и те, кто не совсем. И сейчас они пришли на повторное кодирование или на усиление кода.

**— Через какое время после сеанса можно заметить результат?**

— По-разному. Это зависит от пациента, его организма, то есть, многих факторов. Но обычно первые результаты можно ощутить через неделю после начала лечения. Одно дело, что это результат маленький, и для того, чтобы добиться конечного результата, надо потрудиться 2-3 месяца. Необходимо время и для того, чтобы ***самим*** пациентам утвердиться в стремлении похудеть, не набирать вес. Это самое важное. Потому что просто временно похудеть можно и без нашей помощи, без кодирования. Многие из приходящих к нам и голодали, и сидели на диетах, но, к сожалению, опять набирали вес. А все потому, что тут важно перестроить привычки. Перестроить свое отношение ко многому, перестроить обмен веществ! А это достаточно серьезная задача. Обрести формы — это труд. Представьте, у нас кодировались знаменитые спортсмены, имевшие проблемы с избыточным весом. Так вот даже им приходилось ***еще больше*** двигаться, чтобы достичь своей цели. Даже с нашей помощью!

**— Не секрет, что есть люди, которые, наоборот, мечтают прибавить в весе. Помогает ли Ваш метод кодирования им?**

— Помогает в том случае, если они раньше были полнее и, скажем, их худоба связана с каким-то психологическим воздействием, является следствием каких-то нервных переживаний. В таких ситуациях психотерапевтическая помощь может помочь поправиться. Когда к нам обращаются с подобной просьбой, мы спрашиваем, был ли человек когда-то полнее, то есть, имеется ли у него запас жировых клеток. Ведь жировые клетки как растягиваются, так и сжимаются. Это значит, могут как наполняться жиром, так и "опадать". Закладывается их определенное количество в раннем детстве. Если нет запаса жировых клеток, то ты хоть кодируйся, хоть раскодируйся — не поможет.

**— Клиника у Вас частная. Казалось бы, как бизнесмен, Вы должны быть заинтересованы в большем количестве больных. А как врач, я предполагаю, в меньшем. Легко ли справляться с таким противоречием?**

— Да, у нас действительно частная клиника, точнее, медицинский центр. Но, во-первых, я не бизнесмен. Хотя и занимаюсь частной практикой, я все-таки остаюсь врачом в большей степени. К тому же, работаем мы от общественной организации — "Республиканского общества за трезвость". Начинали с лечения алкоголизма, проблем наркологического характера, и лишь позднее развился тот профиль, в котором работаем сегодня. Считаю, это неплохо, что мы сами зарабатываем себе на жизнь. При этом замечу, что честь врача и материальное отражение его профессионализма — скорее вопрос врачебной этики. Важно найти грань, когда с одной стороны это будет материально выгодно, а с другой, и это для меня главное, достаточно профессионально, то есть, действительно полезно людям.

**— Вы — за платную медицину?**

— Она так или иначе вынуждена переходить на платное лечение. Уровень мировых цен на лекарства, аппаратуру напрямую сказывается на ней. А наше лечение, кстати, одно из самых дешевых. А результаты его порой просто бесценны. Ведь что такое, скажем, для пожилого человека сбросить лишние килограммы веса? Зачастую это значит ликвидировать гипертонию, сердечные заболевания...



## *О ПОДАРКАХ*

Весенний праздник — 8 Марта, конечно же, нельзя представить без подарков виновницам торжества. И очень важно знать, как их выбирать и дарить.

Главное — чтобы подарок принес радость. Как дарят и что дарят — это позволяет делать выводы о характере дарящего. Подарок как зеркало, в котором можно увидеть тщеславную спесь и скупость, легкомыслие и расточительность, ум и юмор, отсутствие вкуса и бескорыстие.

Мужчинам нельзя рассматривать подарок ни как обременительную обязанность, ни как денежную трату. Делая подарок, он должен радоваться тому, что приносит радость женщине. Тот, кто руководствуется этим правилом, не ошибется в выборе подарка.

## *Улыбнитесь*

ЖЕНСКАЯ ЛОГИКА

Мало того, что мужчина, еще и оправдывается.

КОГДА МУЖ ОПАЗДЫВАЕТ

Филе осетрины порезать на порции, посыпать солью, перцем, запанировать в муке и весь вечер жарить во фритюре. На готовую рыбу положить ломтик лимона, посыпать зеленью петрушки или укропа, дождаться мужа и перевернуть все это ему на голову.

НИКАКОЙ РАЗНИЦЫ

— Тебе не кажется, что у блондинок более мягкий характер, чем у брюнеток или рыжеволосых?

— Не вижу разницы. Моя жена перебывала во всех этих трех ипостасях.

ЛИЧНЫЙ КАБИНЕТ

— Твоя жена много времени проводит на кухне?

— О да!

— Тогда она, наверное, хорошая хозяйка?

— Что ты! На кухне стоит наш телефон!



МНОГОСТАНОЧНИЦА

ПОПРОБУЙ УГОДИ!

— Какое платье мне сегодня надеть, красное или зеленое? — спрашивает жена у мужа.

— Какое хочешь.

— Ну а ты как думаешь?

— Зеленое.

— Но оно не очень теплое, а сегодня холодновато.

— Тогда красное.

— Я не очень себя хорошо чувствую, и оно будет подчеркивать мою бледность.

— Делай что хочешь!

— Я так и знала, тебя никогда не интересует, как я одеваюсь!

Алексей
**ФЕСЬКОВ**



### *ОКА*

*Она не Дама от Адама,*
*Ей чужд сценарий обезьян,*
*Она из пены океана*
*На берег вышла без изъяна,*
*Где повстречался ей Адам.*
*Вдохнув в него земные страсти,*
*Разгладив шрамы от когтей,*
*Она познала сущность власти,*
*Признав безвластье частью*
*счастья,*

*И стала радостью царей.*
*С тех пор, когда о ней поют,*
*Её рисуют, возвышают*
*Мужчины ясно понимают,*
*Кому за что стихи слагают,*
*Кого так зорко берегут.*
*...И как поющая рябина,*
*Как опечаленная ива,*
*Как терпко-горькая калина,*
*И как созревшая малина,*
*Как белоснежный лебедь нежный,*
*Голубка, ласточка, весна*
*Такой она в стихах, она...*
*Она при нем, как лед с огнём,*
*Ведь начиналось всё вдвоём.*

**ГОМЕЛЬСКІ ДЗЯРЖАЎНЫ УНІВЕРСІТЭТ імя Ф.СКАРЫНЫ**

аб'яўляе конкурс на замяшчэнне вакантнай пасады на кафедры:

-- рускага, агульнага і славянскага мовазнаўства — ст. выкладчыка.

Тэрмін падачы заяў — не пазней 1 месяца з дня апублікавання паведамлення.

Заявы накіроўваць на адрас: 246699, г.Гомель, вул.Савецкая, 104.

**РЭКТАРАТ.**

Аўтары надрукаваных матэрыялаў нясуць адказнасць за падбор і дакладнасць прыведзеных фактаў, цытат, эканамічных даных, асабістых імён, геаграфічных назваў і іншай інфармацыі, а таксама за тое, каб у матэрыялах не ўтрымлівалася даных, якія не падлягаюць адкрытый публікацыі. Рэдакцыя можа друкаваць артыкулы ў парадку абмеркавання, не раздзяляючы пункту гледжання аўтара.

ЗАСНАВАЛЬНІК -- Гомельскі дзяржаўны універсітэт імя Ф.Скарыны.

Наш адрас: 246699, г. Гомель, вул. Савецкая, 104, пакой 1-18, тэл. 57-43-21.

Зарэгістравана ў Дзяржкамдруку 26 чэрвеня 1996г. Рэгістрацыйны № 263

Спонсар газеты -- прафком студэнтаў.

Газета набрана и сверстана на настольно-издательском комплексе ИВЦ ГГУ, отпечатана на фабрике "Полеспечать", г.Гомель, ул. Советская, 1.

Якасць друку адпавядае якасці арыгіналаў заказчыка.

Рэдактар
Ул.П.БАЛОГА

Аб'ём 1 друк. арк.
Тыраж 1.000 экз.
Заказ 113.
Падпісана да друку 3.03.1999 г.